# Ніл Гілевіч “Калі рана ўстанеш”: урок літаратурнага чытання

План-канспект урока з метапрадметным зместам
Літаратурнае чытанне. 4 клас

**Н. А. Стральчэня,**
настаўнік пачатковых класаў вышэйшай катэгорыі
Мікашэвіцкай гімназіі імя У.І. Нядзведскага

**Мэты:**

ствараць умовы для фарміравання

- культуралагічнай кампетэнцыі: асэнсавання асаблівасцей davershavanaga жанру, прынцыпаў адбору маўленчага матэрыялу для стварэння паэтычных твораў;

- каммунікатыўнай кампетэнцыі:выяўляць свае думкі, пачуцці ў вершаванай форме.

**Задачы:**

- садзейнічаць развіццю творчых здольнасцей вучняў, фарміраванню іх мастацкага густу;

-пазнаёміць вучняў з новым раздзелам вучэбнага дапаможніка;

-развіваць уменне узнаўляць тэкст па пытаннях і шляхам выбарачнага чытання;

- фарміраваць уменні правільнага, асэнсаванага і выразнага чытання твора;

- выказваць уласныя і аўтарскія адносінны да зместу верша, вызначаць яго тэму і галоўную думку;

-выхоўваць у вучняў патрэбу быць актыўным у паўсядзённым жыцці.

**Тып урока:**урок вывучэння новага матэрыялу.

**Абсталяванне:** партрэт Ніла Гілевіча і выстава яго дзіцячых кніг; відэаролік песні Валерыі Яскевіч на словы Ніла Гілевіча «Калі рана ўстанеш», мультымедыйная прэзентацыя ў праграме PowerPoint, раздаткавы матэрыял для рэфлексіі, нарыхтоўкі-заданні для будавання дома, карткі з заданнямі.

**Ход урока**

1. **Этап намэтнаці**

Вось ужо звінеў званок,
Запрасіў нас на ўрок.
Добры дзень, я вас вітаю,
Да заняткаў запрашаю.
Хай занятак будзе плённым ,

І цікавым, і натхнёным.

Поспехаў я вам жадаю,

Калі што – я паспрыяю (поспособствую).

Дом — сімвал сям'і.Сёння на ўроку мы пабудуем дом. Але для гэтага патрэбна добра працаваць. Кожны яго кірпічык (цаглінка)- заданне. Будзьце ўважлівыя.

-Як называецца апошні месяц зімы?

**Практыкаванні для рэгулявання моўнага дыхання (фундамент дома вывешваецца на дошку)**

**“Зімовы непагодлівы вечар”**

Зрабіць глыбокі ўдых носам, на адным выдыху вымаўляць гук “у” з наступным узмацненнем і паслабленнем.

**“Азяблыя рукі”**

Сядзім за партамі, пальцы адной рукі сціскаем у кулачок. Далонню іншай рукі абхапіць кулачок і паднесці да вуснаў.Зрабіць глыбокі ўдых і дьмуць на азяблыя рукі , выдыхаючы паветра павольна і да канца.

**Хвілінка сцэнічнага маўлення.**

Вымавіць слова ДАБРЫНЯ з рознымі пачуццямі: радасці, суму, пагрозы, нерашучасці, гневу.

2. **Этап стварэння адукацыйнай напружанасці (пастаноўка праблемы)**

**( 1-шы кірпіч- заданне вывешваецца на дошку)**

- Сёння мы з вамі будзем знаёміцца з новым раздзелам.

-Прачытайце назву раздзела. (Быць на зямлі чалавекам.)

-Што значыць, на вашу думку, быць чалавекам? Хіба мы з вамі зараз не людзі?

-Чаму ў загалоўку слова зямля напісана з малой, а не з вялікай лігары? (Тут падаецца думка, што трэба быць добразычлівым і паважлівым чалавекам на тым месцы, дзе ты жывёш.

- Якія словы мы пішам з вялікай літары? (Імёны людзей, назвы рэк, азёр, вуліц, гарадоў, абласцей, раёнаў…)

-Хто з вас ужо зараз лічыць, што з'яўляецца сапраўдным чалавекам? Прызнайцеся, калі такія асобы ёсць. Патлумачце сваю думку.

-Уважліва разгледзьце малюнак-застаўку. Ці адпавядае адлюстраванае на ім назве раздзела?Чаму?

**-Чытанне і асэнсаванне паэтычных радкоў Змітрака Марозава пра прызначэнне чалавека на зямлі**. **( 2-гі кірпіч-заданне вывешваецца на дошку)**

-Ці можна пагадзіцца з думкаю пісьменніка Змітрака Марозава? Чаму?

- Як вы лічыце, чаму мы павінны будзем вучыцца ў гэтым раздзеле?

**-Знаёмства з задачамі да раздзела на с. 4 вучэбнага дапаможніка**.

**Этап знаёмства з новай тэмай ( 3-ці кірпіч-заданне вывешваецца на дошку)**

-Сёння мы будзем на ўроку знаёміцца з вершам вядомага беларускага пісьменніка Ніла Гілевіча. Ці знаёмы вам гэты паэт? (**Партрэт вывешваецца на дошку)**

Нарадзіўся 30 верасня 1931 года ў вёсцы Слабада Лагойскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і. Бацька будучага пісьменніка працаваў старшынёй сельскага Савета, дома бываў рэдка. Выхаваннем трох дачок і пяці сыноў займалася ў асноўным маці. Першыя гады пасля вайны Ніл Гілевіч працаваў паштальёнам у калгасе. У 1951 годзе скончыў Мінскае педагагічнае вучылішча. Апошні год навучання спалучаў з працай настаўніка ў адной са школ Мінска. Скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэту. Пачаў друкавацца ў 1946 годзе.

На жаль, ён памёр у 2016 годзе. Ніл Гілевіч вядомы як паэт-лірык, вучоны, перакладчык, сатырык, драматург.

**Звярнуць увагу на выставу яго кніг.**

На уроку мы пазнаёмімся з вершам Ніла Гілевіча "Калі рана ўстанеш".

-У чым адрозненне вершаванага твора ад прозы? ( рыфмаю)

Але спачатку адкажыце ці знаёмыя вам словы.

**Слоўнікавая работа (4-ты кірпіч- заданне вывешваецца на дошку)**

- Зыбкі- у стане хістання
- Зыркі- яркі, асляпляльны
- Дзівосных- чудесных
- Суцешыць – супакоіць (утешить)
- Шпаркі – хуткі

-Выразнае чытанне верша «Калі рана ўстанеш» настаўнікам.

- Які настрой выклікае ў вас гэты верш?

Высвятленне эмацыянальнага ўспрымання: якія радкі вам спадабаліся найбольш і чаму? Прачытайце іх і патлумачце свой выбар.

**Фізхвілінка ( 5-ты кірпіч-заданне вывешваецца на дошку)**

Устаньце, дзеткі, усміхніцеся,
Зямлі нашай пакланіцеся
За шчаслівы дзень учарашні.
Усе да сонца пацягніцеся,
Улева, управа нахіліцеся,
Верацёнцам пакруціцеся.
Раз прысядзьце, два прысядзьце
І за парты ціха сядзьце.

3. **Замацаванне тэмы**

**Аналіз твора і другасны сінтэз (6-ты кірпіч- заданне вывешваецца на дошку)**

Чытанне верша вучнямі самастойна з мэтай адказу на пытанне 1 (с. 7).

Аналітычная гутарка па пытаннях 2-6 метадычнага апарату:

выбарачнае чытанне, тлумачэнне сэнсу вобразных слоў і выразаў, вызначэнне пісьменніцкіх адносін да жыцця.

Вызначэнне тэмы і галоўнай думкі верша. (Тэма сэнсу чалавечага жыцця. Асноўная думка — заклік паэта да чытача быць актыўным і дзейным чалавекам у паўсядзённым жыцці.)

Рубрыка «У свеце прыгожага» (с. 7): слуханне і ацэнка аўдыязапісу песні на словы Ніла Гілевіча.

Падрыхтоўка да выразнага, правільнага і асэнсаванага чытання верша ўголас з захаваннем інтанацыі сказа, паўз, патрэбнага тону і тэмпу, перадача рытму.

Чытанне верша

- **“ланцужком”,**

**-“птушыны базар”,**

**- парнае чытанне,**

**- практыкаванне “На адным дыханні”** (зрабіць глыбокі ўдых і прачытаць сказ ад пачатку і да канца)

**Хто хутчэй знойдзе ўрывак, прачытаны настаўнікам.**

**Рубрыка «У свеце прыгожага» (с. 7): (7-мы кірпіч- заданне вывешваецца на дошку)**

Слуханне і ацэнка аўдыязапісу песні на словы Ніла Гілевіча.

Падрыхтоўка да выразнага, правільнага і асэнсаванага чытання верша ўголас з захаваннем інтанацыі сказа, паўз, патрэбнага тону і тэмпу, перадача рытму.

4. **Гімнастыка для вачэй (трэнажор)**
5. **Этап работы над адкрытым заданнем**

**Работа ў парах (вывешваецца на дошку дах у доме)**

Вучні атрымоўваюць карткі з заданнем: па дадзенай рыфме скласці невялічкі верш. Або прыдумаць свае рыфмы, каму будзе цяжка скласці верш.

**Рыфмы**

1. Зямлі – жылі

Ганаруся – Беларусі

2. Шчаслівы – пералівы

Скажу – задрыжу

3. Мала – стала

Надзей – людзей

Зачытаю вам верш Ніла Гілевіча “Я беларус”, з прапанаванымі вам рыфмамі.

Я — беларус, я нарадзіўся
На гэтай казачнай зямлі,
Дзе між лясоў і пушчаў дзікіх
Адвеку пра́шчуры жылі.

Я — беларус, я ганаруся,
Што маю гэтае імя:
Аб добрай славе Беларусі
У свеце знаюць нездарма!

Я — беларус, і я шчаслівы,
Што маці мову мне дала,
Што родных песень пералівы
І зблізку чую, і здаля.
Я — беларус, і хоць сягоння
Яшчэ малы, але скажу:
Я родам з племя непакорных
І прад бядой не задрыжу!..

У нас у класе таксама ёсць паэты. Яны прымалі ўдзел у раённым конкурсе вершаў. Зараз некаторыя з іх мы паслухаем. (Свае вершы чытаюць 2-3 вучні.) (Адзнакі)

Чытанне і асэнсаванне прыказак на тэму сэнсу чалавечага жыцця, шчасця і ўзаемаадносін з людзьмі.

**Работа ў групах (вывешваецца на дошку акно ў доме.)**

Кожнай групе прапаную картку з прыказкай. Растлумачыць іх сэнс.

Жыццё пражыць – не поле перайсці.

Кожны чалавек – свайго шчасця каваль.

Хто толькі сам сябе любіць, таго ніхто не любіць.

Не зведаўшы броду – не сунься ў воду.

Любіш катацца – любі і саначкі вазіць.

Чужым розумам не пражывеш.

(Выказванні вучняў)

6. **Этап рэфлексійнага асэнсавання вынікаў урока**

Якія галоўныя ўрокі  жыцця вы атрымалі сёння на ўроку?

(Пабудаваць дом, пасадзіць дрэва і ўзгадаваць сына ці дачку — гэга і ёсць, на думку мастака, агульначалавечыя абавязкі  і законы жыцця кожнай беларускай сям'і.)

-На дошцы размешчаны 3 групы слоў блакітнага, зялёнага і чырвонага колеру. Прачытайце іх. У вас на партах ляжаць кругі такіх жа колераў. Падыміце круг таго колеру, якія словы адлюстроўваюць ваш настрой ад сённяшняга ўрока літаратурнага чытання.

-Зараз мы з вамі пабудавалі цацачны дом. Але я спадзяюся, што калі вы станеце дарослымі, створыце свае сем’і, пабудуеце сапраўдныя дамы і станеце сапраўднымі людзьмі.

7. **Дамашняе заданне**. Выразнае чытанне верша Ніла Гілевіча “Калі рана ўстанеш”. (**вывешваюцца на дошку дзверы дома.)**

Зямлі – жылі
Ганаруся- Беларусі

Шчаслівы – пералівы
Скажу- задрыжу

Мала – стала
Надзей – людзей

Зямлі – жылі
Ганаруся- Беларусі

Шчаслівы – пералівы
Скажу- задрыжу

Мала – стала
Надзей – людзей

Зямлі – жылі

Ганаруся- Беларусі

Шчаслівы – пералівы

Скажу- задрыжу

Мала – стала

Надзей – людзей

Зямлі – жылі

Ганаруся- Беларусі

Жыццё пражыць – не поле перайсці.

Кожны чалавек- свайго шчасця каваль.

Хто толькі сам сябе любіць, таго ніхто не любіць.

Не зведаўшы броду – не сунься ў воду.

Любіш катацца – любі і саначкі вазіць.

Чужым розумам не пражывеш.

**асалода**

**весялосць**

**радасць**

**шчасце**

---

**упэўненасць**

---

**цікаўнасць**

неўпэўненнасць

асцярога

сумненне

увага

хваляванне

падазронасць

**апатыя**

**шок**

**жах**

гнеў

**смутак**

**трывога**

адчай

Літаратурнае чытанне 4 клас

**Тэма: Ніл Гілевіч "Калі рана ўстанеш"**

**Мэты:**

ствараць умовы для фарміравання

- культуралагічнай кампетэнцыі: асэнсавання асаблівасцей вершаванага жанру, прынцыпаў адбору маўленчага матэрыялу для стварэння паэтычных твораў;

каммунікатыўнай кампетэнцыі: выяўляць свае думкі, пачуцці ў вершаванай форме.

**Задачы:**

- садзейнічаць развіццю творчых здольнасцей вучняў, фарміраванню іх мастацкага густу.
-пазнаёміць вучняў з новым раздзелам вучэбнага дапаможніка;
-развіваць уменне узнаўляць тэкст па пытаннях і шляхам выбарачнага чытання;
- фарміраваць уменні правільнага, асэнсаванага і выразнага чытання твора;
- выказваць уласныя і аўтарскія адносінны да зместу верша, вызначаць яго тэму і галоўную думку;
-выхоўваць у вучняў патрэбу быць актыўным і дзейным чалавекам у паўсядзённым жыцці.

**Абсталяванне:** партрэт Ніла Гілевіча і выстава *яго* кніг; відыа ролік песні Валерыі Яскевіч на словы Ніла Гілевіча «Калі рана ўстанеш», прэзентацыя Power Point, раздаткавы матэрыял для рэфлексіі, карткі з заданнямі.

**Этапы ўрока**

1. **Этап намэтнаці**
2. **Этап саздання адукацыйнай напружанасці (пастаноўка праблемы)**
3. **Этап знаёмства з новай тэмай**
4. **Фізхвілінка**
5. **Замацаванне тэмы**
6. **Этап работы над адкрытым заданнем**
7. **Этап рэфлексіўнага асэнсавання вынікаў урока**
8. **Дамашняе заданне**

---

Літаратурнае чытанне 4 клас

**Тэма: Ніл Гілевіч "Калі рана ўстанеш"**

**Мэты:**

ствараць умовы для фарміравання

- культуралагічнай кампетэнцыі: асэнсавання асаблівасцей вершаванага жанру, прынцыпаў адбору маўленчага матэрыялу для стварэння паэтычных твораў;

каммунікатыўнай кампетэнцыі: выяўляць свае думкі, пачуцці ў вершаванай форме.

**Задачы:**

- садзейнічаць развіццю творчых здольнасцей вучняў, фарміраванню іх мастацкага густу.
-пазнаёміць вучняў з новым раздзелам вучэбнага дапаможніка;
-развіваць уменне узнаўляць тэкст па пытаннях і шляхам выбарачнага чытання;
- фарміраваць уменні правільнага, асэнсаванага і выразнага чытання твора;
- выказваць уласныя і аўтарскія адносінны да зместу верша, вызначаць яго тэму і галоўную думку;
-выхоўваць у вучняў патрэбу быць актыўным і дзейным чалавекам у паўсядзённым жыцці.

**Абсталяванне:** партрэт Ніла Гілевіча і выстава *яго* кніг; відыа ролік песні Валерыі Яскевіч на словы Ніла Гілевіча «Калі рана ўстанеш», прэзентацыя Power Point, раздаткавы матэрыял для рэфлексіі, карткі з заданнямі.

**Этапы ўрока**

**1.Этап намэтнаці**
**2.Этап саздання адукацыйнай напружанасці (пастаноўка праблемы)**
**3.Этап знаёмства з новай тэмай**
**4.Фізхвілінка**
**5.Замацаванне тэмы**
**6.Этап работы над адкрытым заданнем**
**7.Этап рэфлексіўнага асэнсавання вынікаў урока**
**8.Дамашняе заданне**

# Быць на зямлі чалавекам




Photo by Scherbakov Sergey

# ДАБРЫНЯ

РАДАСНА

СУМНА

З ПАГРОЗАЙ

НЕРАШУЧА

# Быць на зямлі чалавекам



**ЗЫБКІ**- У СТАНЕ ХІСТАННЯ

**ЗЫРКІ**- ЯРКІ, АСЛЯПЛЯЛЬНЫ

**ДЗІВОСНЫХ**- ЧУДЕСНЫХ

**СУЦЕШЫЦЬ** – СУПАКОІЦЬ (УТЕШИТЬ)

**ШПАРКІ** – ХУТКІ



